# СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА ЯК АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА ПРАВА БЕЛАРУСІ XVI СТАГОДДЗЯ

**А. В. Кожар**
*выкладчык кафедры эканомікі і права*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

Артыкул прысвечаны Статуту 1529 года, як першаму зводу законаў на тэрыторыі Беларусі. Аўтар абгрунтоўвае верагоднасць ўдзелу ў працы па стварэнні Статута 1529 года Ф. Скарыны. Паказвае найбольш прагрэсіўныя і гуманістычныя палажэнні, замацаваныя ў законе.

Статья посвящена Статуту 1529 года, как первому своду законов на територии Беларуси. Автар обосновывает вероятность участия в работе по созданию Статута 1529 года Ф. Скорины. Показывает наиболее прогресивные и гуманистические положения, закрепленные в законе.

The article is devoted to the Statute of 1529, as the first set of laws on the territory of Belarus. The author substantiates the probability of participation in the work on the creation of the Statute of 1529 by F. Skorina. Shows the most progressive and humanistic positions enshrined in law.

Як вядома беларускі народ мае шматвяковую гісторыю, за якую стварыў багатую нацыянальную культуру, выпрацаваў свае дзяржаўна-прававыя ідэі, свае нацыянальнае права, якое складалася і развівалася разам з узнікненнем і развіццём дзяржавы на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Да пачатку XX ст. гісторыкі лічылі, што ў беларускага народа наогул не было свайго права. Вядомы савецкі гісторык У.І. Пічэта у сваёй працы пісаў: «Ніхто з даследчыкаў мінулага не пярэчыў супраць вывучэння права кожнага славянскага народа паасобку. Аднак толькі для беларускага і ўкраінскага народаў рабілася выключэнне на той падставе, што гэтае права створана рускім народам і таму не падлягае індывідуальнаму відавому вывучэнню» [3, с. 413].

Такі погляд, што на Беларусі не было свайго права вядома памылковы, бо, вывучая гісторыю Беларусі, развіццё яе права лёгка прасачыць па тагачасных крыніцах права.

Крыніцы права маюць вялікае значэнне для вывучэння нашай гісторыі. У іх народ бярэ неабмежаваныя веды, свае ўладкаванне і дзяржаўны лад. Чым больш развіты грамадскія адносіны, тым больш дасканала распрацаваны прававыя нормы і ўся сістэма заканадаўства.

Тэрмін «крыніца права» вучонымі ўжываецца ў некалькіх значэннях: крыніца як аснова абавязковай сілы прававых нормаў альбо рашэнняў аб ужыванні права. У такім выпадку «крыніца права» вызначаецца правам, якое дзейнічае ці тэарытычнымі догмамі, якія прыняты на практыцы пры ўжыванні права; крыніца ў фармальным значенні – гэта форма ўзнікнення норм права; крыніца ў матэрыяльным значэнні ўяўляе сабой абставіны, якія робяць ўплыў на ўзнікненне і змест норм права. Сярод іх эканамічныя, палітычныя і іншыя грамацкія адносіны, стан развіцця навукі і тэхнікі, цывілізацыйны ўзровень развіцця грамацтва; Крыніца права як тэкст, у якім змешчаны нормы права, працэс утварэння норм права ў дадзенай сістэме права. Акрамя таго, тэксты, якія маюць гістарычнае значэннеякія называюцца таксама помнікамі права.

У навуковай літаратуры тэрмін «крыніцы права» ужываецца ў сэнсе «крыніца пазнання права». Гэта паняцце ахоплівае ўсе тое, што змяшчае ў сабе дадзеныя дазваляючыя пазнаць характар і змест права розных дзяржаў у розныя перыяды іх гісторыі. Сюды можна аднесці тэксты законаў, запісы звычаеў, судовыя справы, выступленні юрыстаў у судовых справах, летапісы, гістарычныя хронікі і гэтак далей.

Для Беларусі такімі крыніцамі з’яўляліся старажытныя дагавары і граматы і як вышэйшая форма крыніц права Вялікага Княства Літоўскага з’явіліся Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гадоў.

Навуковую распрацоўку крыніц права на Беларусі пачаў Францыск Скарына.

У сваіх працах Скарына вызначаў тэарытычныя асновы патрабаванняў, якім павінна задавальняць права кожнай дзяржавы. Так, на яго думку, неабходна «абы были права их или закон почтивый, справедливый, можный, потребный, пожиточный подле прирождения водлуг обычаев земли, часу и месту, пригожий, явный, не имея в собе закритости не к пожитку единого человека, но к посполитому доброму написанный» [1, с. 109]. Далей ён гаворыць аб «ровнай свабоде всем» і «общем имении всех» [1, с. 113, 116].

Скарына абгрунтоўваў неабходнасць сістэматызаваць мясцовае права і садзейнічаў стварэнню Статута 1529 года. Магчыма таксама, што ён і сам удзельнічаў непасрэдна ў падрыхтоўцы Статута 1529 года. Аб гэтым сведчаць некалькі фактаў. Па-першае, у гэты час у Вільні быў вядомы толькі адзін навуковец, які добра ведаў права, як рымскае, так і мясцовае. І гэта быў Францыск Скарына.

Па-другое, Статут павінен быў быць выдадзены у скарынінскай тыпаграфіі, што таксама сведчыць, што Скарына меў дачыненне да статута.

Па-трэцяе, у Статуце выкарыстоўваецца сістэматызацыя нормаў, не характэрная для класічнага рымскага права. Але вельмі падобная сістэмы якую вылучаў Скарына. Так, вучоны выдзяляў права: паспалітае (якое ўключала нормы грамадзянскага і сямейнага права), міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае.

Па-чацьвёртае, многія патрабаванні да права, якія выказваў Скарына, былі выкарыстаны пры складанні першага Статута.

Напрыклад, патрабаванне, каб Статут быў для усіх роўны, было запісана у арт. 9 раздзела 1 Статута 1529 г. «Тэж хочем и вставляем, и вечными часы маеть быти ховано, иж вси подданые наши, так вбогие, яко и богатые, которого раду колве або стану были бы, ровно а одностайным тым писаным правом мають сужоны быти» [2, с. 34].

Гэтае прагрэсіўнае палажэнне было замацавана ў Статуце ўпершыню, і на тэрыторыі многіх Еўрапейскіх дзяржаў роўнасць перад законам была ўведзена толькі праз 200-250 год.

Патрабаванне Скарыны, што закон павінен служыць усім таксама выкарыстана ў Статуце, бо да яго прыняцця ў кожнай мясцовасці дзейнічала свае мясцовае права.

Ідэі суверэнітэту выказаныя Скарынай былі замацаваны ў артыкулах раздзела 3. Згодна з арт. 1 гэтага раздзела князь абяцаў не наносіць шкоды Вялікага Княства Літоўскага і панам радным, калі ён будзе валодаць яшчэ і іншай дзяржавай. Арт. 3. раздзела 3 не дазваляў даваць чужаземцам дзяржаўных пасад і земляў [2, с. 48]. Гэтая ідэя патрыятызму была заснавана не на этнічнай ці канфесійнай прыналежнасці, характэрнай для сярэдневечча, а на дзяржаўна-палітычнай прыкмеце.

Аналізуючы нормы Статута 1529 года, можна зрабіць вывад, што за асноўную крыніцу яго было ўзята звычаёвае права беларускіх зямель, якія складалі аснову Вялікага Княства Літоўскага, а таксама нормы пісанага права, якія былі выкладзены раней ў прывілеях.

Пры распрацоўцы Статута 1529 года яго складальнікі ўпершыню вырашылі шэраг вельмі складаных тэарытычных і практычных пытанняў, такіх, як пытанне аб размежаванні нормаў права па галінах, размяшчэнне іх у пэўнай сістэме. Яны ўвялі шмат новых прававых норм, у якіх адлюстраваны тагачасныя таварна-грашовыя адносіны і якія раней былі не вядомы праву Вялікага Княства Літоўскага. Складальнікі Статута не прытрымліваліся сістэмы кадыфікацыі, прынятай у рымскім праве, а выпрацавалі сваю. У яе аснову пакладзены новыя прынцыпы:

суверэннасць дзяржавы (насуперак сярэдневяковаму касмапалітызму), адзінства права, прыярытэт пісанага права. Статут уключаў нормы агульнага права і спецыяльныя нормы, якія забяспечвалі прывілеі пануючаму класу або яго групам.

Статут быў уведзенны ў дзеянне 29 верасня 1529 года. Ен складаўся з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў (пазнейшыя дапаўненні павялічылі іх да 283).

У Статуце былі юрыдычна замацаваны асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, прававое становішча класаў, саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых органаў дзяржаўнага кіравання і суда. Абвяшчалася правіла паводле якога ўсе асобы павінны былі судзіцца паводле норм, выкладзеных у Статуце.

Вялікі князь абавязваўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не дапускаць іншаземцаў на дзяржаўныя пасады, не даваць ім маенткаў, не адбіраць у мясцовых феадалаў пасады і маемасці без суда, прытрымлівацца ўсіх старых законаў і звычаеў.

Абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, фармальнай роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачаннага на абарону з удзелам адваката. Адначасова ў Статуце абвяшчалася захаванне прывілеяў і льгот для феадалаў.

Ідэі гуманізму паўплывалі на нормы крымінальнага і цывільнага права выкладзеныя ў Статуце. Так, у арт.7 раздзела І абвяшчалася, што ніхто не можа адказваць за чужую віну, а крымінальнае пакаранне трэба назначаць толькі асобам, віна якіх даказана ў судзе [2, с. 33].

Нормы дзяржаўнага права, выкладзеныя ў Статуце, у сваей сукупнасці ўяўлялі своеасаблівую феадальную канстытуцыю, у якой упершыню вызначалася структура і характар дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, замацоўваліся асноўныя правы і прывілеі пануючага класа і саслоўя шляхты.

З-за таго што дакладна не вядома, хто ўдзельнічаў у распрацоўцы Статута, ўся слава выдання Статута належыць Вялікаму князю Літоўскаму Жыгімонту Казіміравічу. Аб вялікай заслуге складальнікаў Статута 1529 года, гаварылася ў пахвале Жыгімонту, якая была напісана Войцехам Гаштольдам, ваеводай Віленскім і канцлерам Вялікага Княства Літоўскага. У сваім лісце ён ставіў князя Жыгімонта вышэй за ўсіх князей Вялікага Княства Літоўскага, бо ён даў справядлівае адзінае права для ўсей дзяржавы.

Статут зрабіў значны ўплыў на развіцце права Расіі, Польшчы, Украіны, Латвіі і Эстоніі, і дзейнічаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Літвы і пасля ліквідацыі Вялікага Княства Літоўскага.

Нягледзячы на тое, што развіццё права ў Вялікім Княстве Літоўскім праходзіла паступова, эвалюцыйным шляхам, на працягу дзесяцігодзяў, калі выдаваліся Статуты Вялікага Княства Літоўскага, але прававыя тэорыі, якія былі распрацаваны дзяржаўнымі дзеячамі, зрабілі на самой справе рэвалюцыйны пераварот у прававой культуры Вялікага Княства Літоўскага.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Алексютовіч М.А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд. Мінск : Выд-ва АН БССР, 1958. 145 с.

2. Пичета В.И. Белоруссия и Литва XV-XVI вв.: (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития) / В. И. Пичета. М. : Издательство Академии наук СССР, 1961. 814 с.

3. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года / Академия наук Белорусской ССР, Отдел правовых наук. Минск : Издательство Академии наук БССР, 1960. 253 с.